УДК 37(476)(091)"15"

# УСТАЛЯВАННЕ ЕЗУІЦКАГА ОРДЭНУ Ў ПОЛЬШЧЫ І ВКЛ (ДА ПАЧАТКУ 1570-х гг.)

***Андрэй Самусік***

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

a.f.samusik@gmail.com

Разгледжаны працэс запрашэння езуіцкага ордэну ў Польшчу і ВКЛ. Вызначана роля ў гэтай справе нунцыя Д.Ф. Камендоні, біскупа вармійскага С. Гозія, біскупа віленскага В. Пратасевіча, а таксама караля і вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста. Акцэнт зроблены на аналізе стварэння Віленскага езуіцкага калегіўма. Адзначана, што яго ўзнікненне было выклікана не толькі супрацьстаяннем з пратэстантамі, але і жаданнем перадухіліць арганізацыю ў

сталіцы ВКЛ свецкага каталіцкага ўніверсітэта накшталт Кракаўскай акадэміі. Таксама згадана адкрыццё ў азначаны час езуіцкіх калегіўмаў у Брунсбергу, Пултуску, Яраславе і Познані.

***Ключавыя словы: Контррэфармацыя, езуіцкі ордэн, калегіўм, В. Пратасевіч, Вільня, Жыгімонт ІІ Аўгуст***

# ESTABLISHMENT OF THE JESUIT ORDER IN POLAND AND THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA (BEFORE THE BEGINNING OF THE 1570s)

***Andrej F. Samusik***
*Belarus State Economic University, Minsk, Belarus*

The process of inviting the Jesuit Order to Poland and the Grand Duchy of Lithuania is considered. Definitely the role of Nuncio D.F. Camendoni, Bishop of Warmia S. Gozi, Bishop of Vilno V. Protasevich, as well as King and Grand Duke Sigismund II Augustus. The emphasis is placed on the analysis of the creation of the Vilno Jesuit Collegium. It is noted that its emergence was caused not only by confrontation with Protestants, but also by the desire to prevent the organization of a secular Catholic university like the Krakow Academy in the capital. The opening of Jesuit collegiums in Brunsberg, Pultusk, Yaroslavl and Poznan at the specified time was also mentioned.

***Keywords: Counter-Reformation, Jesuit Order, Collegium, V. Protasevich, Vilno, Sigismund II August***

Наведваючы некаторыя з айчынных ці замежных барочных касцёлаў сярод шматлікіх алтароў, вязак пілястраў ды выяў святых можна ўбачыць даволі дзіўную скульптурную кампазіцыю – нібыта прарастаючы са сцяны порцік, дзе апорныя калоны “падаюць” у бакі, а анёлы падтрымліваюць іх, недаючы такім чынам канчаткова абрушыцца ўсёй канструкцыі. Менавіта ў ролі апошніх і бачылі сябе езуіты, манаскі ордэн якіх быў заснаваны ў 1534 г. на хвалі Контррэфармацыі з мэтай умацаваць пахіснуўшыяся пад ціскам Рэфармацыі пазіцыі каталіцкай царквы. Зрабіць гэта яны планавалі праз адпаведнае выхаванне моладзі. Заснавальнік ордэну І. Лайёла пісаў, што будучыня належыць тым, хто трымае ў руках маладое пакаленне [6, с. 64-65].

Адна з прычын падобнага захаплення езуітамі заключаецца ў тым, што да іх з’яўлення каталіцкая царква параўнальна мала зрабіла ў справе пашырэння адукацыі. Датычыцца гэта і ВКЛ, дзе Віленскае біскупства здолела адкрыць усяго адну навучальную ўстанову з выкладаннем сямі навук вызваленых – Віленскую кафедральную школу (1397), адкуль лепшыя вучні з’язджалі ў Кракаўскую акадэмію [9, с. 271-272].

Відавочна, што такі тандэм не мог стрымаць пашырэнне на абшарах Польшчы і ВКЛ ідэй пратэстантызму, носьбітамі якіх з’яўляліся шматлікія мясцовыя выхаванцы германскіх універсітэтаў. Спробы ж Жыгімонта І Старога прыпыніць пашырэнне рэфарматарскага руху праз стварэнне перашкод для вучобы ў германскіх універсітэтах, забарону на ўвоз адтуль кніг і запрашэнне хатніх гувернёраў з ліку іх выпускнікоў істотнай карысці не прынеслі. Менавіта таму ў тутэйшым каталіцкім асяроддзі шмат хто звязваў свае надзеі на вяртанне было магутнасці ды ўплыву з езуітамі. Першы раз прапанова запрасіць іх прагучала на Петракоўскім саборы (1542-1544), дзе разглядалася пытанне аб дазволе ордэну адкрыць школы ў Кракаве, Познані, Варшаве, Львове і Вільне [8, с. 566-567]. На Варшаўскім Сінодзе 1561 г. гнезненскі архібіскуп Я. Пшэрэмбскі зноў прапанаваў даручыць справу рэфармавання адукацыйнай справы езуітам, але большасць прысутных выступіла супраць, заявіўшы, што ў краіне хапае дасведчаных асоб і праблема толькі ў фінансавым забеспячэнні школ [4, с. 266].

Галоўным прыхільнікам ідэі запрашэння езуітаў з’яўляўся папскі нунцый у Польшчы Д.Ф. Камендоні. Менавіта ён здолеў пераканаць біскупа вармійскага С. Гозія ў неабходнасці рэалізацыі гэтай ідэі на практыцы [5, с. 237-238]. Пасля атрымання згоды генерала ордэна Я. Лайнэза ды кіраўніка паўднёвагерманскай правінцыі П. Канізія восенню 1564 г. у падкантрольны біскупу Брунсберг (Бранеў) прыбыла 11 манахаў з Кёльна, Трыра і Рыма. У пачатку наступнага года яны адкрылі тут 5-класны калегіўм [4, с. 366, 370-372].

С. Гозій, пры гэтым, не абмежаваўся толькі справамі ўласнай епархіі, а пачаў схіляць іншых біскупаў да аналагічных дзеянняў. Першым адгукнуўся біскуп плоцкі А. Наскоўскі, які аддаў езуітам школу-калонію Кракаўскай акадэміі ў Пултуске – езуіты ў 1566 г. пераўтварылі яе ў 5-класны калегіўм. Падтрымаў іерархаў і Жыгімонт ІІ Аўгуст – 23 сакавіка 1565 г. ён прадставіў езуітам роўныя з іншымі манаскімі ордэнамі правы ў дзяржаве [11, с. 115-118].

У ВКЛ прыхільнікам езуітаў быў віленскі біскуп В. Пратасевіч, які ўпершыню заявіў аб намеры спрыяць прыбыццю езуітаў на перамовах з Д.Ф. Камендоні яшчэ ў 1553 г. калі займаў пасаду біскупа луцкага. У 1563-1564 гг. ужо ў рангу біскупа віленскага ён вёў перамовы аб магчымасці адкрыцця ў сталіцы ВКЛ езуіцкага калегіўма з прадстаўніком аўстрыйскай правінцыі ордэну Б. Гаставінай. Аднак, для

выканання яго просьбы патрабаваўся час, бо на тэрыторыі апошняй мелася толькі два езуіцкіх асяродка (Вена і Прага), якія не маглі адразу ж выдзяліць неабходныя выкладчыцкія кадры [3, с. 606]. Да таго ж, Жыгімонт ІІ Аўгуст не жадаў сварыцца з мясцовымі пратэстантамі і толькі пасля смерці кн. М. Радзівіла Чорнага перамяніў сваё меркаванне на гэты конт. 10 студзеня 1565 г. Д.Ф. Камендоні пісаў С. Гозію, што ён пераканаў манарха ў неабходнасці адкрыцця калегіўма ў Вільні. 12 студзеня гэтага ж году ва ўласным лісце ў Рым да кардынала К. Барамея нунцый прасіў таго пачаць шукаць годных прафесараў тэалогіі, філасофіі і матэматыцы. Аднак, ад'езд Д.Ф. Камендоні з Польшчы ў снежні 1565 г. замарудзіў ажыццяўленне гэтай справы [5, с. 238-239].

Зноў ідэя аб запрашэнні езуітаў у Вільню ўзнікла праз некалькі год. Да Жыгімонта ІІ Аўгуста з адпаведным хадайніцтвам звярнуліся дэпутаты сойма. Да таго ж, зноў актывізаваўся В. Пратасевіч. Ён заявіў, што па завяшчанню кн. М. Радзівіла Чорнага буйныя сродкі выдзяляюцца на карысць Віленскай кальвінскай школы, якая ў хуткім часе можа быць пераўтворана ў калегіўм. Прадстаўнік біскупа – сакратар вялікага князя, сталічны войт А. Ратундус 3 студзеня 1568 г. з гэтай нагоды пісаў С. Гозію наступнае: "Паспрабуйце пераканаць правінцыяла ордэна езуітаў (*меўся на ўвазе кіраўнік аўстрыйскай правінцыі Л. Маджіё* – А.С.), каб ён як мага хутчэй даслаў сваіх братоў у Вільню, да таго калі да нас прыбудуць вучоныя ерэтыкі з Б'яндратай, таму што яны, хутчэй за ўсё, прывабяць да сябе ўсю літоўскую моладзь". Таксама ён адзначаў у лісце, што сярод "ерэтыкаў" ёсць тыя, хто чакае езуітаў, бо не жадае траціць грошы на замежнае навучанне ўласных дзяцей [7, с. 43-44].

Без асаблівых пярэчанняў, аднак, можна пагадзіцца з правамернарсцю толькі другой часткі гэтага ліста. Яго ж пачатак са спасылкай на пагрозу з боку пратэстантаў быў яўна перабольшаны і разлічаны на традыцыйнае ўспрыманне іх ордэнам у якасці асноўных супернікаў. Смерць кн. М. Радзівіла Чорнага прывяла Віленскую кальвінскую школу ў глыбокі занепад, а стаўшы каталікам кн. М.Кр. Радзівіл Сіротка не спяшаўся выводзіць яе з крызісу. Ды і перамовы з Г. Б'яндратай скончыліся няўдачай яшчэ ў пачатку 1560-х гг. У выніку ствараецца ўражанне, што рэальная прычына прыспешвання езуітаў да актывізацыі сваёй дзейнасці ў рэгіёне хавалася за "шырмай" магчымага ўзрастання ўплыву кальвіністаў. На самой справе, можна меркаваць, што В. Пратасевіча куды больш хвалявала далейшая секулярызацыя сталічнай школы пры касцёле св. Яна, якая пачалася ў 1566 г., калі яе рэктарам стаў іспанец П. Раізій (былы прафесар рымскага права Кракаўскай акадэміі). Са згоды вялікага князя Жыгімонта ІІ Аўгуста ён увёў у школе выкладанне юрыдычных навук (мясцовае, рымскае, грэчаскае, саксонскае, магдэбургскае права) і такім чынам рыхтаваў у Вільні адкрыццё ўніверсітэта. Гэтыя планы былі добра вядомы віленскаму біскупу, бо сярод тутэйшых настаўнікаў быў і яго аднадумца – згаданы вышэй А. Ратундус [2, с. 77-78].

Адметна, што на афіцыйным узроўні В. Пратасевіч увогуле ігнараваў адукацыйныя намаганні свайго адзінаверцы, заяўляючы аб адсутнасці ў ВКЛ нейкай альтэрнатывы езуітам. Ва ўласным фундушавым запісу на карысць Віленскага езуіцкага калегіўма ад 25 жніўня 1578 г. ён пісаў наступнае: "Так як мы даўно ўжо заўважылі, што Радзіме, ва ўсім вялікай, багатай і квітнеючай, не хапае толькі аднаго – што няма ў яе ніякіх школ і калегій, дзе для славы Божай і карысці Рэчы Паспалітай маглі б публічна выкладацца добрыя навукі, дзе моладзь магла б атрымліваць адукацыю… не выдаткоўваючы сродкаў на паездкі ў замежныя вучылішчы… то мы, абдумваючы, чым бы маглі быць карысны гэтай нашай Радзіме і маці… вырашылі… заклікаць езуітаў – людзей вядомых і па вучонасці і па набожнасці…" [7, с. 42-43].

Мясцовае грамадства, аднак, успрымала сітуацыю інакш. Сведчаннем гэтага з'яўляецца працэс набыцця ў М. Ясінскага за 4 тыс. коп літоўскіх грошаў вялікага будынку для размяшчэння езуітаў у Вільні. У першым варыянце купчай ад 1 ліпеня 1568 г. гаворка ішла выключна аб арганізацыі ў яго памяшканнях езуіцкай школы: "Князи бискупове их милость Виленские не мают того дому… ни на што иного держати, ани оборочати, одно на пожиток речи посполитое земское тутошнего панства великаго князства Литовскаго для наук и цвичэнья в нем сынов земских и иных и всяких обчих, то есть меновите на колеиум докторов товариства езуитов… которых князь бискуп его милость до того панства а до места Виленского призвати и в том дому мешканьем их уфундовати и осадити умыслил…". Але, 23 верасня гэтага ж году прадавец дадаў параграф аб тым, што пры адмове ордэна распачаць сваю асветніцкую дзейнасць у горадзе будынак павінен быць перададзены іншым адпаведна падрыхтаваным асобам каталіцкага веравызнання, якія пагадзяцца адкрыць у ім свецкую навучальную ўстанову: "А где бы тая братья закону езуитов неяко в тот край и до того места прийти и в нем осесть воли не мели, тогды тот дом ни нашто иного, одно предсе на колеиум инших докторов и людей учоных а ку наукам и цвиченью сынов земских подле обычаю колеиум инших мест держан и хован быти мает, веры християнское повшехное и послушенства святое столицы апоштольское рымское…" [1, с. 15, 21]. Зразумела, што найперш на ўвазе меліся П. Раізій ці прадстаўнікі Кракаўскай акадэміі, якія маглі б і аб'яднацца для супрацы ў сталіцы ВКЛ. Зараз, відавочна, нельга даказаць наяўнасць змовы паміж В. Пратасевічам ды М. Ясінскім наконт уключэння ў купчую азначанага дапаўнення, але тое, што яно паскорыла прыбыццё езуітаў у Вільню не выклікае сумненняў.

Разам з тым, адбылася гэтая падзея толькі праз год – у верасні 1579 г. у сталіцы ВКЛ В. Пратасевіч урачыста сустрэў дэлегацыю, у склад якой уваходзіў аўстрыйскі віцэ-правінцыял Ф. Суніер і 5 яго

набліжаных. Ва ўласнай прамове да іх біскуп звярнуўся да гісторыі краіны, ўзгадаўшы колькі карысці прынеслі прыняўшыя каталіцызм Міндоўг ды Ягайла. Езуітаў прываблівала істотнае пашырэнне ды ўмацаванне аўстрыйскай правінцыі ордэна, колькасць калегіўмаў у якой узрастала з 2 да 5. У выніку, яшчэ да завяршэння перамоў з Венай ды Рымам, двое з прыбыўшых езуітаў з канца 1569 г. пачалі весці заняткі ў першых двух граматычных класах – А. Фрызэ ды Я. Петранэлі выкладалі асновы старажытных моў ажно 60 шляхетным выхаванцам. Летам 1570 г. у Вільню прыбыў аўстрыйскі правінцыял Л. Маджыё для завяршэння справы арганізацыі ў горадзе калегіўма і афармлення яго фундушу – адпаведныя дакументы былі падпісаны 18 ліпеня 1570 г. і з верасня гэтага ж году былі адкрыты ўсе 5 асноўных класаў з дадатковымі курсамі нямецкай і рускай моў, а таксама арыфметыкі. 25 лютага 1572 г. славацкі лінгвіст Ф. Здзеларытц пачаў выкладаць тут курс філасофіі. У 1574 г. Л. Кракерам была заснавана кафедра матэматыцы, а П. Віяна стаў чытаць тэалогію маральную і палемічную з пункту гледжання канцэпцыі Фамы Аквінскага [12, с. 85, 128-129].

Таксама у азначаны час езуіцкія калегіўмы распачалі сваю дзейнасць у Яраславе на Галіччыне (1571; фундацыя С. Адравонж Косткі ды яе дачкі Г. Астрожскай) і ў Познані (1573; ініцыятыва тутэйшага біскупа А. Канарскага ды папскага нунцыя В. Порціка) [10, с. 122-123].

Такім чынам, відавочна, што з'яўленне езуітаў ў Польшчы ды ВКЛ стала у першую чаргу праявай жадання асобных біскупаў стрымаць пашырэнне пратэстантызму. Таксама іх непакоіла магчымасць узрастання ўплыву Кракаўскай акадэміі і ўзнікнення новага ўніверсітэту ў Вільні. Пры гэтым, уладкаванне езуітаў за няпоўныя дзесяць год ажно ў 5 гарадах у розных кутках Рэчы Паспалітай з аднаго боку сведчыла аб імкненні каталіцкай часткі грамадства да пачатку Контррэфармацыі, а з іншага ж боку дазволіла членам дадзенага ордэну пераўтварыць свае першыя асяродкі ў буйныя рэлігійна-асветныя цэнтры, стаўшыя трывалай асновай для далейшай экспансіі ў рэгіёне. На яго ж, у кіраўніцтва езуітаў былі далёка ідучыя планы. Згаданы вышэй Ф. Суніер у лісце да генерала ордэна Э. Меркурыяна наконт перспектыў умацавання яго падначаленых у Рэчы Паспалітай пісаў наступнае: "Адкрывае гэта нам шырокія дзверы ў Маскву, а адтуль праз Тартарыю зможам трапіць і ў Кітай. Акрамя гэтага не трэба забываць аб Швецыі ды Інфлянтах, да якіх з тых краёў таксама можна дастаць" [13, с. 37].


1. Акты издаваемые комиссиею, Высочайше учреждённою для разбора древних актов в Вильне : в 39 т. – Вильна, 1865-1915. – Т. XX. – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – CCXXVI, 669 с.
2. Бардах, Ю. Литовские статуты – памятники права периода Возрождения / Ю. Бардах // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI веке. – М. : Наука, 1976. – С. 71-93.
3. Гудавичюс, Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года / Э. Гудавичюс. – М. : Фонд им. И.Д. Сытина, 2005. – 680 с.
4. Жукович, П.Н. Кардинал Гозий и польская церковь его времени / П.Н. Жукович. – СПб. : Типография Ф.Г. Елионского и К°, 1882. – 542 с.
5. Любович, Н. Папский нунций Коммендоне в Польше / Н. Любович // Журнал Министерства Народного Просвещения. – 1887. – № 1-2. – С. 68-98, 203-239.
6. Самусік, А.Ф. Выкладанне дысцыплін гуманітарнага цыкла ў езуіцкіх навучальных установах Беларусі (другая палова XVI – сярэдзіна XVIII стагоддзяў) / А.Ф. Самусік // Веснік адукацыі. – 2006. – № 1. – С. 64-71.
7. Харлампович, К. Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань : Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.
8. Bukowski, J. Dzieje reformacyi w Polsce od wejścia jej do Polski aż do jej upadku : w 2 t. – Kraków : Druk. W.L. Anczyca i Spółki, 1883-1886. – T. 1. – 1883. – 712 s.
9. Kurczewski, J. Biskupstwo Wilenskie od jego założenia aż do dni obecnych, zawierające dzieje i prace biskupów i duchowieństwa djecezji Wileńskiej, oraz wykaz kościołów, klasztorów, szkół i zakładów dobroczynnych / J. Kurczewski. – Wilno: Druk. J. Zawadzkiego, 1912. – 614 s.
10. Łukaszewicz, J. Historya szkół w Koronie i w Wielkim Księstwie Litewskim od najdawniejszych czasów aż do roku 1794 : w 4 t. / J. Łukaszewicz. – Poznań : Wyd-wo W. Deckera i Spółki, 1849-1851. – T. 1. – 1849. – 472 s.
11. Pamietniki o dawnej Polsce z czasow Zygmunta Augusta, objemujace listy Jana Franciszka Commendoni do Karola Borromeusza : w 2 t. – Wilno : Druk. J. Zawadzkiego, 1851. – T. 2. – 328 s.
12. Piechnik, L. Dzieje Akademii Wileńskiej : w 4 vol. / L. Piechnik. – Rome : Apud "Institutum Historicum Societatis Jesu", 1983-1990. – Vol. I. – 1984. – 263 s.
13. Tazbir, J. Piotr Skarga. Szermierz kontrreformacji / J. Tazbir. – Warszawa : Państwowe Wyd-wo "Wiedza Powszechna", 1978. – 344 s.